Д.А. Лаўшук

# Кантрольныя заданні па курсе

# "ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ"

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2007

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ "МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
УНІВЕРСІТЭТ імя А.А. КУЛЯШОВА"

Д.А. Лаўшук

# Кантрольныя заданні па курсе "ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ"

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2007

УДК 811.161.3'36
ББК 81.411.3
Л28

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета МДУ імя А.А. Куляшова*

Рэцэнзент
кандыдат філалагічных навук дацэнт
МДУ імя А.А. Куляшова
*І.М. Ячмянёва*

**Лаўшук, Д.А.**
Л28 Кантрольныя заданні па курсе "Гістарычная граматыка беларускай мовы" / Д.А. Лаўшук. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 24 с.

ISBN 978-985-480-407-1.

Кантрольныя заданні па гістарычнай граматыцы беларускай мовы прызначаны для самастойнай работы студэнтаў III курса АЗН факультэта славянскай філалогіі. Могуць быць выкарыстаны і падчас правядзення выніковых заняткаў па гістарычнай фанетыцы і гістарычнай марфалогіі са студэнтамі дзённай формы навучання (спецыяльнасць "Беларуская філалогія" ФСФ, а таксама "Пачатковая адукацыя. Беларуская мова і літаратура" педагагічнага факультэта).

**УДК 811.161.3'36**
**ББК 81.411.3**

**ISBN 978-985-480-407-1.**

© Лаўшук Д.А., 2007
© МДУ імя А.А. Куляшова, 2007

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Кантрольныя работы – адзін з відаў самастойнай працы, які дазваляе студэнтам глыбей засвоіць праграмны матэрыял, а выкладчыкам – выявіць прабелы ў ведах студэнтаў і аказаць ім неабходную дапамогу, акцэнтаваўшы ўвагу падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў на тых пытаннях, якія выклікалі ў выканаўцаў найбольшыя цяжкасці.

У структурным плане кантрольная работа складаецца з дзвюх частак. Першая змяшчае заданні па гістарычнай фанетыцы, выкананне якіх патрабуе ад студэнтаў разумення сутнасці асноўных фанетычных змяненняў дапісьмовай і пісьмовай эпох. Заданні другой часткі пададзены ў тэставай форме. Пры выкананні тэставых заданняў трэба памятаць, што ў кожным пытанні можа быць не толькі адзін, але і некалькі правільных варыянтаў адказу.

Усе кантрольныя і тэставыя заданні складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай для ВНУ па гісторыі беларускай мовы (Ч. I – гістарычная граматыка беларускай мовы).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ЛІТАРАТУРА


1. *Анічэнка, У.В.* Гістарычная фанетыка ўсходнеславянскіх моў / У.В. Анічэнка. – Гомель, 1982.
2. *Анічэнка, У.В.* Марфалогія ўсходнеславянскіх моў / У.В. Анічэнка. – Мінск, 1973.
3. *Анічэнка, У.В.* Мовы ўсходніх славян / У.В. Анічэнка. – Мінск, 1989.
4. *Булыка, А.М.* Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко. – Мінск, 1979.
5. *Воўк-Левановіч, І.В.* Лекцыі па гісторыі беларускай мовы / І.В. Воўк-Левановіч. – Мінск, 1994.
6. *Иванов, В.В.* Историческая грамматика русского языка / В.В. Иванов. – М., 1983.
7. *Лёсік, Я.Ю.* Граматыка беларускае мовы. Фонэтыка / Я.Ю. Лёсік. – Мінск, 1926.
8. *Юргелевіч, П.Я.* Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі / П.Я. Юргелевіч. – Мінск, 1974.
9. *Янкоўскі, Ф.М.* Гістарычная граматыка беларускай мовы / Ф.М. Янкоўскі. – Мінск, 1989.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Частка I

## ФАНЕТЫКА

**Заданне 1. Выпісаць з тэксту словы, у якіх адбыліся фанетычныя змены:**

**а) дапісьмовай эпохі;**

**б) пісьмовай эпохі.**

**Аднавіць старажытныя (агульнаўсходнеславянскія) формы гэтых слоў, выявіць прычыны кожнай змены.**

### Варыянт I

Каб ведаць, колькі працы павінен быў тут класці чалавек, трэба самому ўбачыць гэтую дзялянку... Камяніца – наверсе. Там каржакаваты хвойнічак, як і запамятаюць людзі, усё гэтакі ж самы, росту яму няма. Некаторыя хвоі аж на ралы пабіліся, вяршаліна часта віламі ўбок пайшла. Тут камяніца скрозь. Гэта – узгорак над балотам, над асакою, над сіўцом у лагу. Пакуль з узгорка ў балота, яшчэ як на злосць тую, нібыта і мурог у вочы кінецца, а падыдзеш бліжэй, дык там сівец нібыта што і добрае. Калі мінуць хвойнічак, ідучы ўгару праз яго, дык праз чвэртку кіламетра якога разбяжыцца поле і шлях. Тут трапіш усё адно як у якую-небудзь іншую краіну: поле ўрадлівае, глею, камення – ані звання. Шлях-гасцінец. Старасвецкія бярозавыя прысады загінаюцца ўправа, а адтуль ужо спрадвеку патыхала панскім духам: глухенькае месца, панскае і шляхечае гняздо. Места – так, мае завулкаў і вуліц пад пяцьдзесят; невялічкі гарадок. Стаўшы на ўзгорку, акрай каржакаватага хвойнічку, відаць: чорная вежа сярэдневяковага княжага замка, шэрая касцёльная вежа, зяленая царкоўная, рудая (абшарпаная бляха) былога бернардынскага кляштару. Гэты кляштар, пасля паўстання шэсцьдзесят трэцяга года, расійская імперская ўлада скасавала... Калі з ветрам, дык тут у хвойнічку нават чуваць, як вызваньваюць гадзіны на замкавай вежы... Гукі гэтыя за дзесяць кіламетраў даходзяць сюды выразна. Места гэтае тут відаць добра: яно стаіць на доволі-такі вялікім узгорку.

Поле па той бок хвойніку роўнае, добрае; калі ў каго ёсць каму, як і чым урабіць яго і калі яшчэ яго ёсць, колькі трэба, дык яно табе ў сто столак верне.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Варыянт II

Тут сяляне туляцца адзін да аднаго, як апенькі на трухлявым пні, - лыка, шарачак. Бруд у зрэбных кашулях; пот, мазалі і ані звання прасветлай гадзіны... Тую ж дробную дзялянáчку, з якой я пачаў гэтае апавяданне, нават і пан з царом нікому не адважыліся даць: гэтакая ўжо там нядоля павінна была, няйначай, спасцігнуць кожнага. Так спрадвеку гэты кавалачак і пуставаў, урэзаўшыся адным бокам у сялянскія загоны, а другім у панскі палетак. Ён нібыта лічыўся панскі, але, разам з тым, і сяляне тут жывёлу смела пасвілі і сівец касілі. А пасля неяк пан абводзіў з каморнікам свае межы і тут ужо як мае быць далучыў да сябе гэты куток. Паставілі капец, і цяпер ужо ніхто сюды не меў права паткнуцца. Так ён і марнеў, гэты кавалак, без карысці, нават жывёлу на ім не пасвілі... На ўзгорку ля камення раслі палыны, на ўзлеску цвілі верасы, напрадвесні адгэтуль на ўзбалоцце сцякалі каламутныя ручаіны снегавой вады; каршачкі падпільноўвалі дробных птушак, уночы ваўкі стрыглі зверху вачыма лог. У сонечныя дні, увясну ці ўлетку, на ўзлеску, высланая за доўгія гады хвойнымі іголкамі, зямля добра награецца сонцам.

Раз тут спацыраваў хударлявы папок з таго самага гарадка. У сухім сонечным цяпле ён прысеў пад хвойкаю адпачыць. Ён скінуў боты і грэў ногі. Пасля пачаў павольненька, каб не пакалоць ног, прахаджвацца ўзад і ўперад па сцежцы. Ці ён які псальм мармытаў сабе пад нос танклявым бабскім галаском, ці мо ўспамінаў якую-небудзь, з юнацкіх яшчэ год сваіх, семінарскую песеньку, ці што іншае – адным словам, ён хадзіў тут і ціхенька спяваў, зрабіўшы раптам вынаходства, што сухая зямля, мяккая ад хвойных іголак і моху, цёплая ад сонца, прыемна можа грэць босыя ногі.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

## Варыянт III

Чалавек яшчэ раз зняў шапку. Яшчэ раз скланіўся і пачаў брацца за работу. Увёў каня ў пастронкі. Прымайстраваўся і ўзяў у рукі пугі, каб частаваць ёю каня, гэтае, як казаў папок, божае стварэнне, а сам гатовы да чарговага націрання крывавых мазалёў і да сёмага поту пад зрэбнаю сарочкаю. Неўзабаве, як і заўсёды за гэтай работаю, на ўсю разлегласць чуцён быў ягоны цяжкі, зямлісты голас: “Но, но, малы! Куды! Но!” Зараз жа пастронкі напяліся, як струны, раскудзеленыя вузлы на іх шморгаліся па конскіх баках (кожны дзень па разы тры пастронкі рваліся), конскія рэбры пачалі хадзіць пад скураю, пара павярнула з шыі гэтага божага стварэння і яшчэ больш у яго вытыркнулі лапаткі, косці на крыжы і вострая спіна. Мухі раіліся вакол яго гнойных вачэй...

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гаспадар усё цягавіта і цярпліва, як вол у ярме, пагукваў на свайго каня, конь пяўся, выцягаўся, як мокрая п'яўка. Гэтак яны ўдвух поўзалі па гэтай камяніцы, аж пакуль не прыгнуўся сашнік, скрыгануўшы аб падземны камень, і не парваўся пастронак. Конь, відаць, прывык даўно да гэтай радасці: ён адразу спрытна, не па гадах і сіле сваёй, падаўся назад, але раптам зноў звяў. Пакуль сабраўся нагнуцца і, уціснуўшы ў зямлю губы, згрызці травы, доўга стаяў, аддыхваючыся і спусціўшы мысу пад свае ногі. Адна нага папстрыквала ў калене, сама па сабе, як на спружыне, пакуль ён не аддыхаўся. Гаспадар, угнуўшыся, звязваў пастронак. Пасля, падняўшы плуг і ўпёршы яго ў камень сашнікам, пачаў біць другім каменем зверху – адгінаў. Ён стараўся як мага шпарчэй зрабіць гэта: сонца стаяла высока, недалёка было да поўдня, а ён усяго некалькі разоў прайшоў з плугам. Неўзабаве ён зноў прычапіў плуг да барка. І адарваў каня ад салодкага забыцця.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

## Варыянт IV

Пакуль парабак пану дзякаваў, пан ужо не думаў больш пра гэта: пад'ехаў фаэтон – пан выязджаў кудысьці. Парабак адумаўся толькі тады, калі не было ўжо перад яго вачыма пана, адно пыл курэў з-пад гумавых колаў. От тады парабак радасна і рушыў на агляд панскага падарунка. Ён нешта дзён тры ўсё засаб прыходзіў сюды і кожны раз нёс адсюль у сэрцы сваім няясныя надзеі і сам сябе падбадзёрваў.

Зараз жа трэба было выбірацца з панскай хаты, і ён выбраўся сюды: жыў, як цыган, колькі часу ў хвойнічку, пакуль не апытаў старой хаты на знос. Перавезлі яму хату новыя яго суседзі: сяляне з блізкай вёскі, а склаў ён яе сам, і гэтакім парадкам над узбалоццем на ўзгорку з краю хвойнічку з'явілася малая, як кузня, хаціна.

Цяпер ужо чалавек, б'ючыся, як рыба аб лёд, шукаючы на людзях работы, робячы на блізкіх хутарках, пачаў прыглядацца бліжэй да зямлі, што была навокал яго хаты. Ён думаў: мала што зямля ў гэтым куточку кепская, але, угнаіўшы яе, ураб іўшы, дагледзеўшы, будзе нейк жа расці на ёй. Расце ж вунь у лажку нейк панскі авёс на ёй.

Адным словам, кожны дзень, ідучы куды-небудзь на работу або тупаючы без патрэбы ля хаты, калі работы нідзе не знаходзілася (чалавек не мог уседзець ні хвіліны, склаўшы рукі), ён кідаў вока на лажок унізе і на камяніцу ў сябе пад нагамі, думка яго не магла спакойна мінуць гэтай зямлі, гэтак, як яго нябожчыка бацьку не пакідала думка пра далёкую радзіму. Бо гэта не быў ураджоны тутэйшы чалавек.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Варыянт V

Ён прыйшоў раз у гэты куток на ўзбалоцце ў канцы лета. Людзі бачылі, як ён пільна і задуменна аглядаў гэтую мясцінку, хадзіў, стаяў, глядзеў і па той бок хвайніку, і па гэты, нават спускаўся да балота, падкасаўся і пайшоў крыху па куп'і; у асацэ, праз мох, паміж пальцаў у яго пырскала вада. Людзі ім зацікавіліся: тут жа ўсё было гэтак умеркавана, улегавана дзесяткамі год, гэтак усё было аднастайна, без вялікіх падзей і выдатных здарэнняў. Ён праз некалькі дзён зноў прыйшоў сюды, але цяпер ужо людзі паспелі дазнацца ўсё пра яго. Ужо ведалі, што гэта самы просты чалавек, як апранены, гэтакі сапраўды сам і ёсць: ніхто іншы, як панскі парабак з двара па той бок гарадка. У яго ёсць жонка, два сыны і дачка. Жонка зарабляе за дзень работы пятнаццаць капеек, а дзеці – ну, вядома, менш, бо яны яшчэ малыя на сталы заработак. Двое меншых – зусім яшчэ дзеці, на работу іх бяруць мала калі, ім не заўсёды знойдзецца работа (хіба ўвосень у панскім садзе яблыкі абіраць).

Гэтымі часамі не ўтрымаўся парабак і зрабіў вялікую памылку: трапіліся яму маладыя, неабвучаныя коні і вельмі рваліся ў плузе. Дык там, дзе араў ён, асталася пара ўзрэхаў...

Аканом кінуўся тады шлягануць нагайкаю па парабкоўскіх плячах, але парабак хістануўся ўбок, і аканом з размаху сперазаў сурамцам пад чэрава кабыле, на якой сядзеў. Кабыла рванулася і паімчала аканома па раллі. Яна гэтак тузянулася ўбок, што аконам, на што ўжо добра ездзіў конна, а і то не адзяржаўся, вышмаргнуў адну нагу з стрэмя і бразнуўся вобземлю. Колькі крокаў ён правалокся за кабылай па раллі, пакуль адарваўся.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

## Варыянт VI

Араты абліваўся потам. Ён сарваў з галавы шапку і кінуў на зямлю. Пасля скінуў з сябе камізэльку. Конь зноў павярнуўся ўбок грызці траву. Гаспадар згарнуў рукі: "Божа, божа". Але праз хвіліну ён ужо звыкла абкручваў анучаю на пастронку вузлы, каб не муляла ў конскія бакі. Ён азірнуўся. Да попіка пад'ехала малюпаценькая аднаконная брычачка, хлапчук падганяў гуллівага каня. Ойча духоўны паехаў на спрытным жарэбчыку з спацыру дадому ў гарадок. Жарэбчык падбрыкваў. У гарадку раптам заспявалі званы... Чалавек паражагнаўся на далёкія меставыя вежы з крыжамі, павольна абцёр рукавом з ілба пот і ўзяўся за работу.

Так яго дзэнь пры дні бачылі, як ён варушыўся, клапаціўся, тупаў. Але ён не быў трапяткі. Ён быў высокі, у плячах крыху камляваты. Здаецца, нават, на першы погляд, павольны. Цягавіты. На нагах ён стаяў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

моцна. Ці сонца грэла, ці вецер дзьмуў, ён усё варушыўся на гэтай дзялянцы. Пачынаў ён работу ў шапцы і камізэльцы, канчаў з голай галавою і ў зрэбнай адной кашулі.

Ён з'явіўся тут неяк адразу. Успомнілі, што твар гэты быў некаторым людзям тут знаёмы. Яго і раней некаторыя спатыкалі ў гарадку. Хтосьці ўспомніў, што раз бачыў, як ён выходзіў у нядзелю пасля імшы з касцёла; другі бачыў яго на месце: ён глядзеў, як гаспадар прадаваў карову...

Калі ўсё гэта рабілася, ён не быў яшчэ сівы. Валасы кучараваліся з-пад шапкі, суконная гаспадарская жакетка сядзела ў свята на ім хоць не гладка, але і не кепска: мясцовы кравец (не той, што абшываў паноў і падпанкаў, а той, што меў справу з простымі людзьмі) не даганяў лішне адзежыны да чалавека, а заўсёды напускаў яшчэ па пальцы два паводле меркі.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

## Варыянт VII

Мазавецкі тут і забегаў. Перш за ўсё ён акінуў розумам, хто тут з тутэйшых людзей можа купіць зямлю. Адразу яго думка спынілася на Сурвіле. Пакуль што ён больш не думаў, а адразу рушыў да царквы. Адправа яшчэ не скончылася... Мазавецкі ўвайшоў у царкву і пачаў азіраць народ. Сурвілу ён убачыў ля кліраса: той спрытна падцягваў царкоўнаму кліру задзірыстым голасам. Мазавецкі цярпліва чакаў. А пакуль прычакаў, дык глядзеў і слухаў і разважаў у думках. Філасофія яго ішла ў такім кірунку: "От бо хамская гэтая руская вера. Поп гэты – дык няма, каб паважна, як, напрыклад, ксёндз, рабіў адправу, а пакручваецца, як на ражне, нейк, нават, здаецца, некуды падміргвае адным вокам. А пеўчыя проста дзяруць, як дзеркачамі. Хоць бы гэтаму Сурвілу загадалі змоўкнуць, а то як цвікам па блясе скрабе або кажухом па печы. А Хрыстос – дык таксама не па-людску на крыж прыбіты: не адным цвіком у дзве нагі адразу, а па цвіку ў кожную нагу. От тут і трымайся гэтай веры як хочаш. Дурныя гэтыя мужыкі, што ў каталіцтва не пераходзяць". Тут ён успомніў, што нядаўна, ведучы каталіцкую працэсію, вымушан быў даць дарогу працэсіі праваслаўнай, якую вёў Сурвіла. І, падумаўшы пра гэта, сказаў сабе пад нос з горкім расчараваннем: "І не пяройдуць ніколі, калі век вечны будзе гэтакае права". Хацеў нават плюнуць, але ўсё ж не пасмеў у святым, хоць сабе і ў праваслаўным, месцы так злосна выказваць свой настрой. Тым часам клір царкоўны пажадаў рускаму цару здароўя, і Сурвіла, перасмыкнуўшы сябе "крестным знаменіем", загрукаў ботамі, выходзячы з царквы.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Варыянт VIII

Пакуль яны прайшлі палавіну дарогі да Сурвілавага воза, дык ужо гладка дагаварыліся да таго, што ім абодвум патрэбна было. Мазавецкі, часамі, нават трымаючы Сурвілу за локаць, гэтак развіваў свае думкі:

– Вы, пане Сурвіла, не думайце, што мы прагадаем, калі збяром на гэтую куплю вялікі гурт. Мы можам нават усялякае галетніцкае драбязы назбіраць, няхай дадуць хоць па сто рублёй кожны. На гэтыя грошы мы і адрэжам кожнаму, колькі яму варта будзе паводлуг яго часці. Нам абы не выпусціць, пане Сурвіла, я ж кажу, з рук лепшых кавалкаў, нават, каб і паўвалокі захаваць за сабою, але я думаю, што і па валоцы, а можа нават і больш, загорнем у рукі. Галетніцкая драбяза, я ж кажу, нам не страшна. Абы іншага купца сюды не пусціць. Бо тады, калі захочам у яго адкупіць крыху, дык яму зарабіць трэба будзе даць не малыя грошы. На колькі ў вас, пане Сурвіла, грошай можа хапіць?

Сурвіла адказаў не адразу. Гэта Мазавецкі адразу можа сыпануць словамі: розум ён мае вастрэйшы. А Сурвіла дык гэты мае галаву тупейшую і мазгі павальнейшыя. Але ўжо затое калі наважыць што, дык тады ніхто яго не перапрэ. Калі ўжо ў які бок яго мазгі павернуцца, дык хоць калом іх тады падважвай, усё адно назад не аддумаеш. Дык ён кіўнуў галавою ў знак згоды. Мазавецкі зноў загаварыў:

– Ну, дык згуртоўвайце людзей, якіх ведаеце, а я таксама не буду спаць у шапку.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

## Варыянт IX

Вельмі павольнаю хадою ён варочаўся назад, да сваёй хаты ў каржакаватым хвойнічку. У пустую хату больш яму ісці не хацелася. Сэрцам сваім ён чуў: Адась панёс кудысьці сваю крыўду, знаёмую яму самому з таго часу, калі аканом хацеў яго шляганудь нагайкаю. Ён і сам не стараўся разабрацца цяпер, чаму яго гэтак устрывожыла, што Адась раптам апынуўся з двара на іншай рабоце. Увушшу яго стаяў адказ аднаго з рабочых на шашы: "Знік недзе раптам, калі гэта той, каго вы шукаеце".

Была ноч, калі ён вярнуўся дахаты. Як чорная кузня, яна стаяла тут на самоце. Балота тхнула туманам, каменне на ўзгорку перад ім шарэла ў змроку. Цяжка варушылася ў сэрцы – голыя сцены ў хаце, сурвілава маўчанка з зямлёю, далечыня яшчэ да тае зямлі, на якую толькі малы задатак удалося даць... Думкі ў яго не ішлі, а стаялі, навісалі над сэрцам, як хмары на небе. Пайшоў драбнюсенькі дождж. На небе ясней



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крыху было там, дзе павінен быў быць месяц... Ён раптам падняўся паволі і доўга падпяразваўся па вопратцы. У сенцах абмацаў на сцяне папярочную пілу і падаўся з ёю праз балота на той бок ручаіны, дзе стаяла града лесу. Там ён доўга не шукаў таго, што некалькі дзён да гэтага заўважыў: бураломнае дрэва, даўно сухое, ляжала пад навюсю галля і веццял.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

## Варыянт X

Няміра браўся дадому, глядзеў рухавым вокам на спарахнелую салому на застрэшшы, на бацькаўскую хату, на платцы навокал, на засохлую грудаватую гразь на вуліцы, нахмурваў бровы і запрагаў шпарчэй каня, каб надалужыць страчаны час.

На полі корпаліся людзі, цешыліся з новых дзяляначак зямлі, што натрапіліся ім пасля панскага продажу. Па іржышчы блыталася восеннае белае павуцінне, птушкі збіраліся ў вырай, сонца хадзіла нізка. Шарачак, зрэб'е, злямцованая кудзеля варушыліся разам з людзьмі на загонах, на межах. Ішоў па дарозе пыл, блекла ўвосень зяленіва, ветракі скрыпелі скрыдламі, перамолваючы дробнае жыта на чорную муку. Лясы ўзвышаліся шчыльнымі сценамі, княжацкія і панскія аб'ездчыкі стаялі па каморах. Каршакі падпільноўвалі дробнае птаства; біліся на ралы палявыя дзічкі. Восень несла смугу і доўгія ночы.

Вёсны прыходзілі з каламутаю снегавой вады. Вада бегла імклівымі ручаінамі з узгорка, з хвойніку, праз яго ў балотную лагчыну. За хатаю, у прыбудаваным аполкавым хляве, прыслухоўваўся рухавым вухам да вясны касцісты небарак конь...

Як сцякла вада і тужэла зямля, абмытае каменне на ўзлеску блішчэла пад сонцам, пакуль лета не ўкрые яго тонкім засцілам бялявага пылу.

*(К. Чорны. Бацькаўшчына)*

**Заданне 2. Аднавіўшы старажытныя (агульнаўсходнеславянскія) формы слоў, растлумачыць, як узніклі (шляхам якіх фанетычных ці нефанетычных змяненняў) у сучаснай беларускай мове наступныя чаргаванні (выдзелены ў словах тлустым шрыфтам). Адзначце час узнікнення таго ці іншага чаргавання зычных, галосных або іх спалучэнняў (дапісьмовая ці пісьмовая эпоха).**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт I**

*Сухі – сушыць, сотня – сто, любіць – люблю, блохі – блыха, муха – мусе, плакаць – плачу, лён – ільну, праду – прасці.*

**Варыянт II**

*Страх – страшны, ручка – ручак, купіць – куплю, гром – грымець, снаха – снасе, насіць – нашу, мох – імху, густы – гушча.*

**Варыянт III**

*Сяку – сячэш, локаць – локця, лавіць – лаўлю, воск – вашчына, кроўля – крыю, страха – страсе, касіць – кашу, гінуць – пагібель.*

**Варыянт IV**

*Пяку – пячэш, кубак – кубка, карміць – кармлю, глотка – глытаць, луг – на лузе, маці – мачаха, леў – ільва, памяць – успаміны.*

**Варыянт V**

*Гарадок – гарадка, бягу – бяжыш, лупіць – луплю, хросны – хрысціць, дуга – дузе, пляту – плесці, лазіць – лажу, дух – душа.*

**Варыянт VI**

*Лягу – ляжаш, купец – купца, вяду – весці, трапаць – траплю, блеск – бліскаць, бераг – (на) беразе, вазіць – важу, крык – крычу.*

**Варыянт VII**

*Грэх – грэшнік, кусок – куска, рабіць – раблю, дровы – дрыватня, парог – (на) парозе, леў – ільва, мазаць – мажу, піск – пішчаць.*

**Варыянт VIII**

*Саха – сашнік, пясок – пяску, давіць – даўлю, дрогнуць – дрыжаць, дарога – (у) дарозе, лоб – ілба, пісаць – пішу, лячу – ляцець.*

**Варыянт IX**

*Век – вечны, казка – казак, лупіць – луплю, брод – брыду, плуг – (у) плузе, лоб – ілба, рэзаць – рэжу, краду – крала, пачаць – пачынаць.*

**Варыянт X**

*Слуга – служыць, плаціць – плачу, стажок – стажка, блохі – блыха, луг – (на) лузе, казаць – кажу, дзеўка – дзевак, нувука – вучоны.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Заданне 3. Ахарактарызаваць усе фанетычныя і нефанетычныя змяненні, якія адбыліся ў наступных словах у дапісьмовую і пісьмовую эпохі.**

**Варыянт I**

*Воўк, вароты, аўторак, душа, крыўда, затануць.*

**Варыянт II**

*Праўда, поўны, мяжа, рыбацкі, свёкар, сярэдзіна.*

**Варыянт III**

*Вугаль, насенне, жоўты, долата, боскі, дзеўка.*

**Варыянт IV**

*Вяроўка, застрэшша, поўны, горад, вузел, жучок.*

**Варыянт V**

*Доўга, косцю, жаўток, гараджанін, вецер, ткацкі.*

**Варыянт VI**

*Зацішша, лоўка, варона, шоўк, віхор, восем, стрыгчы.*

**Варыянт VII**

*Дарожка, карысцю, тоўсты, залоўка, стынуць, завушніца.*

**Варыянт VIII**

*Мноства, вугал, жаўток, сярэдзіна, траўка, калоссе.*

**Варыянт IX**

*Галава, доўгі, удава, купец, агонь, княства, маладзіца.*

**Варыянт X**

*Берагчы, сэрца, сярэдзіна, сям'я, роўны, маўчком.*

**Заданне 4. Назваць моцную і слабую пазіцыі для галосных няпоўнага ўтварэння ь і ъ. Вызначыць моцную (+) і слабую (-) пазіцыі рэдукаваных у наступных словах.**

**Варыянт I**

*Алъчьнъ, пьнь, кърмити, дъхорь, зълвъка, ручькъ, съборъ, съвѣдъка, сълньце, шьвьць.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

### Варыянт II

*Сънъмь, гърбъ, мълчати, ръпъть, въторъкъ, шьвьца, кънижька, дьрнъ, блъха, пълнъ.*

### Варыянт III

*Мъхъ, котьлъ, вълчиха, гърньчаръ, вьсь, кънижьникъ, шьвьць, вълкъ, грьмъ, вьрвька.*

### Варыянт IV

*Събьрати, отъдамъ, замъкъ, кърмъ, мъножьство, пьсьца, купьць, кръвь, въторъкъ, дъщанъ.*

### Варыянт V

*Лъбъ, съзъвати, посълъ, пришьльць, вьсѣхъ, Пльсковъ, мотъчькъ, чьтьць, зьрно, пьньмь.*

### Варыянт VI

*Ръжь, вьрхъ, Смольньскъ, възьму, вьсемь, съзьдати, въсходъ, льсть, мьртвьць, подъшьва.*

### Варыянт VII

*Ножькъ, съдоровъ, къняжьскыи, жьрьць, Витьбьскъ, стьжька, осьлъмъ, съзъвати, мьсть, вьсемь.*

### Варыянт VIII

*Шьвьца, дългъ, подъжьдати, мъхъмь, узъкъ, тъпътати, Дьбрянь-ска, съмьрть, дѣвъкъ, бъчькы.*

### Варыянт IX

*Гривьнъ, жьлтыи, Дънепрь, жьньць, львъ, съзъвати, осьлъмъ, пъташьство, кръвь, пришьльць.*

### Варыянт X

*Съвѣдъка, котьлъ, лъбъмь, замъкъ, дьнь, къняжьство, пьньмь, гърбъ, вълчиха, въторъкъ.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Частка II

# МАРФАЛОГІЯ

## Варыянт І

А-1. Колькі тыпаў скланення вылучалася ў агульнаўсходнеславянскай мове?

1) 5;
2) 6;
3) 3;
4) 4.

А-2. Парны лік ужываўся ў мове ўсходніх славян:

1) замест сучаснага множнага;
2) замест сучаснага адзіночнага;
3) для абазначэння 2-х прадметаў ці парных;
4) для абазначэння няпэўнай колькасці.

А-3. Да асабовых займеннікаў адносіліся ў 11 ст.:

1) я, ты;
2) мы, вы;
3) онъ, она, оно;
4) сь, ся, се;
5) тъ, та, то.

А-4. Адзначце кароткія прыметнікі:

1) зялёна (дуброва);
2) нова (хата);
3) бацькаў (хлеб);
4) повен (кошык);
5) суседава (поле).

## Варыянт II

А-1. Колькі склонаў назоўнікаў існавала ў агульнаўсходнеславянскай мове?

1) 6;
2) 5;
3) 7;
4) 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А-2. Да чацвёртага тыпу скланення адносілюя назоўнікі з асновай на:
1) -a, -ja;
2) -i;
3) -u;
4) -o, -jo.

А-3. Асабовыя і зваротны займеннік мелі поўную і кароткую (энклітычную) форму:
1) у Н. і В. скл.;
2) у Д. і В. скл.;
3) у Т. і М. скл.;
4) у Р. і В. скл.;
5) ва ўсіх ускосных склонах.

А-4. Адзначце прыналежныя прыметнікі з суфіксам *-ьjь*:
1) медвежь;
2) отьцевъ;
3) Ярополчь;
4) Мстиславль;
5) сестринъ.

**Варыянт III**

А-1. Клічны склон мелі ў агульнаўсходнеславянскай мове назоўнікі:
1) множнага ліку;
2) ніякага роду першых чатырох тыпаў скланення;
3) толькі адушаўлёныя;
4) мужчынскага і жаночага роду адзіночнсга ліку першых чатырох тыпаў скланення;
5) мужчынскага роду.

А-2. Размеркаванне назоўнікаў па тыпах скланення адбывалася ў агульнаўсходнеславянскай мове ў залежнасці ад:
1) катэгорыі роду;
2) адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці;
3) семантыкі;
4) характару канцавога гука асновы.

А-3. Адзначце энклітычныя формы множнага ліку асабовых займеннікаў:
1) ми, ти;
2) ся, тя;
3) на, ва;
4) ны, вы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А-4. Адзначце правільна ўжытую форму меснага склону поўнага прыметніка мужчынскага роду *новы*:

1) (о) новымь;
2) (о) новомь;
3) (о) новѣмь;
4) (о) новому.

## Варыянт IV

А-1. Пяты тып скланення аб'ядноўваў у агульнаўсходнеславянскай мове назоўнікі:

1) мужчынскага і жаночага роду з асновай на -а, -ја;
2) мужчынскага і ніякага роду з асновай на зычны;
3) мужчынскага роду з асновай на -u;
4) усіх трох родаў з асновай на зычны.

А-2. Адзначце назоўнікі, якія адносіліюя ў мове ўсходніх славян да трэцяга тыпу скланення:

1) сынъ;
2) волъ;
3) конь;
4) окъно;
5) вьрхъ;
6) пиръ;
7) другъ.

А-3. Адзначце словы, у склад якіх уваходзяць былыя склонавыя формы асабовых ці зваротнага займенніка:

1) парася;
2) вяртаюся;
3) шырокае (поле);
4) пішыце;
5) прыгожая (дзяўчына).

А-4. Адзначце правільныя сцвярджэнні: кароткія прыметнікі ў сучаснай беларускай мове:

1) не змяняюцца па склонах;
2) выступаюць у сказе ў ролі азначэння;
3) не маюць форм роду;
4) маюць формы ліку.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Варыянт V

А-1. Назоўнікі былога пятага тыпу скланення адносяцца ў сучаснай беларускай мове да:

1) трэцяга скланення;
2) рознаскланяльных;
3) першага скланення;
4) другога скланення.

А-2. Назоўнікі *букы, тыкы, любы* адносіліся ў агульнаўсходнеславянскай мове да:

1) пятага скланення;
2) першага скланення;
3) шостага скланення;
4) чацвёртага скланення.

А-3. Адзначце формы меснага склону займеннікаў мужчынскага роду, якія адпавядаюць нормам агульнаўсходнеславянскай мовы:

1) тымь;
2) симь;
3) моемь;
4) нашемь.

А-4. Адзначце прыметнікі, што страцілі значэнне вышэйшай ступені:

1) лепшы;
2) малодшы;
3) здаравейшы;
4) старшы;
5) большы.

## Варыянт VI

А-1. Сучасныя назоўнікі *мядзведзь, зяць, смерць, волас* адносіліся ў агульнаўсходнеславянскі перыяд да:

1) другога скланення;
2) трэцяга скланення;
3) чацвёртага скланення;
4) пятага скланення.

А-2. У сучаснае трэцяе скланенне ўвайшлі назоўнікі з былога:

1) першага;
2) другога;
3) трэцяга;
4) чацвёртага;
5) пятага;
6) шостага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А-3. Адзначце правільна запісаныя формы творнага склону займеннікаў *къто, чьто* перыяду агульнаўсходнеславянскай пісьменнасці:

1) кимь, чимь;
2) кемь, чемь;
3) цѢмь, чѢмь;
4) цѢмь, чимь.

А-4. Адзначце гістарычна складаныя словы:

1) той;
2) хто;
3) меншы;
4) сам;
5) дванаццаць.

**Варыянт VII**

А-1. Адзначце назоўнікі, якія адносіліся ў старажытнасці да другога скланення:

1) огнь;
2) рабъ;
3) домъ;
4) стогъ;
5) тьсть;
6) зять.

А-2. Найбольшы ўплыў на уніфікацыю склонавых канчаткаў назоўнікаў множнага ліку аказалі канчаткі назоўнікаў былога:

1) першага скланення;
2) другога і трэцяга скланення;
3) чацвёртага скланення;
4) пятага і шостага скланення.

А-3. Да займеннікаў мяккай разнавіднасці скланення адносіліся ў агульнаўсходнеславянскай мове:

1) и, ја, јэ;
2) нашь, наша, наше;
3) такъ, така, тако;
4) самъ, сама, само.

А-4. Адзначце спрагальныя формы нетэматычных дзеясловаў цяперашняга часу:

1) соуть;
2) станоу;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) дамь;
4) вѣмь;
5) хвалить.

## Варыянт VIII

А-1. Якія з прыведзеных форм клічнага склону адпавядаюць нормам агульнаўсходнеславянскай мовы:

1) огню;
2) рыбо;
3) стоже;
4) сыну;
5) рабу.

А-2. Якія назоўнікі не адносіліся ў агульнаўсходнеславянскай мове да другога скланення:

1) низъ;
2) попъ;
3) волъ;
4) даръ;
5) око;
6) ягня;
7) нож.

А-3. Да займеннікаў цвёрдай разнавіднасці скланення адносіліся ў агульнаўсходнеславянскай мове:

1) тъ, та, то;
2) вьсь, вьсе, вься;
3) мои, мое, моя;
4) сь, ся, се.

А-4. Адзначце складаныя дзеяслоўныя формы агульнаўсходнеславянскай мовы:

1) аорыст;
2) умоўны лад;
3) імперфект;
4) перфект;
5) загадны лад.

## Варыянт IX

А-1. У сучаснае трэцяе скланенне ўвайшлі назоўнікі з былых:

1) першага і чацвёртага тыпаў скланення;
2) другога і чацвёртага тыпаў скланення;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) другога і трэцяга тыпаў скланення;
4) першага, чацвёртага, шостага тыпаў скланення.

А-2. Адзначце назоўнікі, якія маглі ўжывацца ў агульнаўсходнеславянскай мове ў форме клічнага склону:
1) журавль;
2) червь;
3) теля;
4) мещанинъ;
5) мати.

А-3. Размясціце склонавыя формы прыналежнага займенніка жаночага роду *моя* ў наступным парадку: родны, давальны, вінавальны, творны склон:
1) моеи;
2) моеђ;
3) моею;
4) мою.

А-4. Адзначце простыя дзеяслоўныя формы агульнаўсходнеславянскай мовы:
1) плюсквамперфект;
2) аорыст;
3) імперфект;
4) перфект;
5) умоўны лад.

## Варыянт X

А-1. Адзначце назоўнікі, якія адносіліся ў старажытнасці да чацвёртага тыпу скланення:
1) господь;
2) жизнь;
3) мужь;
4) студень;
5) ножь;
6) старьць.

А-2. Адзначце формы роднага склону назоўнікаў, запісаныя па нормах 11 ст.:
1) дома;
2) меду;
3) страху;
4) души;
5) воза.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А-3. Адзначце правільна ўжытыя формы вінавальнага склону ўказальнага займенніка *тъ*:

1) тътъ;
2) то;
3) тъи;
4) того;
5) ты;
6) тои.

А-4. Адзначце дзеясловы, якія адносіліся ў агульнаўсходнеславянскай мове да трэцяга тэматычнага класа:

1) носити;
2) лазити;
3) мазати;
4) писати;
5) лизати.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА .......... 3
ЛІТАРАТУРА .......... 4
**Частка I.** ФАНЕТЫКА .......... 5
**Частка II.** МАРФАЛОГІЯ .......... 15

Вучэбнае выданне

**Лаўшук** Дзіна Аляксееўна

**Кантрольныя заданні**
**па курсе**
**"ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА**
**БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ"**

Тэхнічны рэдактар *Г.М. Гладун*
Камп'ютэрная вёрстка *В.С. Маляўка*

Падпісана да друку 2.10.07.
Фармат 60x84/16. Гарнітура Arial Cyr.
Ум.-друк. арк. 1,4. Ул.-выд. арк. 1,5. Тыраж 80 экз. Заказ 491

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт
імя А.А. Куляшова", 212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
ЛВ № 02330/278 ад 30.04.2004

Надрукавана на рызографе аддзела аперавтыўнай паліграфіі
МДУ імя А.А. Куляшова.
212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова